Культурный потенциал региона выражен в его историческом наследии. Наличие уникальных исторических объектов может привлечь людей со всего мира. Знакомство с историей и историческими объектами — сильнейший побудительный туристский мотив. Наиболее этот мотив силен у людей среднего возраста и студенческой молодежи. Люди этих возрастных категорий составляют 67 % туристов по всему миру [3, с. 114].

Исходя из этого, можно сказать, что туризм занимает одно из ведущих мест в жизнедеятельности студенческой молодежи и оказывает положительное влияние непосредственно на самих студентов и на развитие их социальной активности, в связи с этим необходимо развивать возможности туризма среди студентов.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Список использованных источников**

1. *Биржаков, М. Б.* Введение в туризм / Н. Б. Биржаков. – 3-е изд. – СПб. : «Изд. дом Герда», 2002. – 320 с.

2. *Биржаков, М. Б.* Индустрия туризма / М. Б. Биржаков, В. И. Никифоров. – СПб. : Герда, 2003. – 257 с.

3. *Дурович, А., Анастасова, Л.* Маркетинговые исследования в туризме : учеб.-практ. пособие / А. Дурович, Л. Анастасова. – М. : Новое знание, 2002.

4. URL: http://edu.gov.by/main.aspx?guid=18021&detail=431763.

*Д. В. Герасімёнак, магістрант БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – І. Н. Колабава,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## МУЗЕЕФІКАЦЫЯ АРХІТЭКТУРНА-ПРЫРОДНЫХ КОМПЛЕКСАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Рубеж XX–XXI стст. у музейнай практыцы можна вызначыць як «пераходны этап», звязаны з кардынальнымі трансфармацыямі музейнай прасторы і яе сэнсаў [4, с. 4]. Стратэгіі развіцця музейнай справы XX ст. не толькі геаграфічна пашырылі вобласць існавання музейных форм, уключыўшы практычна ўсе краіны свету ў музейнае будаўніцтва, але і прапанавалі новыя тыпы музеяў, імкліва павялічыўшы кола магчымых аб’ектаў збіральніцкай дзейнасці, а таксама напрамкаў і форм экспазіцыйнай і адукацыйнай практыкі.

Даўгалецце музея як гістарычнай з'явы, гібкасць музея як культурнай формы, адаптыўнасць як сацыякультурнага інстытута і праектыўнасць як культурнай мадэлі дазваляюць гаварыць аб правамернасці яго вывучэння ў культуралагічнай парадыгме. Культуралагічны падыход з улікам разнастайнасці тэорый і канцэпцый дазваляе сінтэзаваць дадзеныя сацыяльных і гуманітарных навук для пабудовы пазнавальнага базісу музеязнаўства. У сілу гэтага сістэмнае даследаванне музея як з'явы культуры дазваляе разглядаць вывучаемы феномен у комплексе ўзаемасувязяў, найбольш поўна раскрыць яго прыроду і сутнасць. Спосабы і формы функцыянавання музея як сацыякультурнага інстытута спрыяюць усталяванню тых істотных генетычных сувязяў, якія першым чынам тлумачаць спецыфіку духоўнага зместу музейнай дзейнасці.

Міждысцыплінарны характар культуралогіі абумоўлівае інтэрдысцыплінарнасць музеязнаўства, дапамагаючы выйсці на новы ўзровень абагульнення, актуалізуючы гісторыка-культурную праблематыку (генэзіс і эвалюцыя музея, гістарычная тыпалогія, дынаміка сацыякультурных функцый), каталізуючы тэарэтычныя пошукі (фенаменалогія музея, гнасеалагічны і аксіялагічны сэнс «музейнасці», інфармацыйна-камунікацыйны патэнцыял музея, яго статус у сучаснай культуры), а таксама спрыяючы даследаванню прыкладных праблем (захаванне і трансляцыя матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сацыялізацыя і інкультурацыя асобы, інфармацыйныя тэхналогіі ў музеі).

Музеефікацыя – кірунак музейнай дзейнасці, які заключаецца ў пераўтварэнні гісторыка-культурных або прыродных аб'ектаў у аб'екты музейнага паказу з мэтай максімальнага захавання і выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай, мастацкай каштоўнасці [2].

Музеефікацыя помнікаў гісторыі і культуры прадугледжвае даследаванне помніка, яго кансервацыю і рэстаўрацыю, захаванне ці аднаўленне мастацка-архітэктурнага ці гісторыка-культурнага асяроддзя, арганізацыю ўмоў для яго агляду шляхам распрацоўкі маршрутаў агляду, вызначэнне відавых кропак і спецыяльных месцаў для агляду, растаноўку маршрутных указальнікаў і г. д.

Сярод спосабаў захавання помнікаў гісторыі і культуры музеефікацыя лічыцца адным з самых лепшых відаў іх аховы. Толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў музейным выкарыстанні архітэктурна-прыродны комплекс можа праявіць усе свае ўласцівасці, у першую чаргу – свой інфармацыйны патэнцыял.

Важным фактарам развіцця працэсу музеефікацыі становіцца распачатая з канца 1950-х гг. арганізацыя музеяў-запаведнікаў. З іх стварэннем звязаны першыя спробы паказу цэлых фрагментаў гарадскога і сельскага асяроддзя як помнікаў культуры. Аднак сярод аб'ектаў музеефікацыі на гэтым этапе пераважаюць помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва, археалогіі, садова-паркавага мастацтва. Далейшым развіццём працэсу музеефікацыі стала распрацоўка паняцця архітэктурна-прыродны комплекс – стварэння музеяў у сукупнасці архітэктурнага, гістарычнага і прыроднага асяроддзя [1, с. 43].

Архітэктурна-прыродны комплекс – разнавіднасць музея, у склад якога акрамя экспазіцый ўваходзяць архітэктурныя, гістарычныя і прыродныя помнікі, значныя для захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны краіны або рэгіёну.

У канцы 1980-х гг. Д. А. Равіковіч прапанавала класіфікацыю музеяў па прыкмеце ажыццяўлення імі сваіх навукова-дакументацыйных функцый [3, с. 23]. У адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй вылучаюць музеі калекцыйнага і ансамблевага тыпаў.

У аснове музея калекцыйнага тыпу ляжыць калекцыя прадметаў, якая адпавядае профілю музея (асноўныя намаганні накіраваны на яе фарміраванне). Дакументаванне такія музеі ажыццяўляюць сродкамі захавання, камплектавання, вывучэння фондаў музея.

Ансамблевыя музеі – музеі, дзейнасць якіх грунтуецца ў першую чаргу на ансамблях нерухомых помнікаў архітэктуры, гісторыі, прыроды (г. зн. на архітэктурна-прыродных комплексах). Унутры групы вылучаюцца наступныя віды музеяў [5, с. 49]:

– музеі пад адкрытым небам (напрыклад, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту) – група музеяў, асноўныя аб'екты і экспазіцыі якіх размешчаны па-за памяшканнямі, на адкрытых тэрыторыях. Музеі пад адкрытым небам ствараюцца на аснове нерухомых помнікаў гісторыі і культуры на месцы іх знаходжання і ў прыродным асяроддзі ці на аснове перавозкі помнікаў на спецыяльна адведзеную тэрыторыю з іншых месцаў;

– музеі-запаведнікі (Дзяржаўны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Нацыянальны гісторыка-культурны му-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зей-запаведнік «Нясвіж») – група музеяў пад адкрытым небам, якія валодаюць асаблівай каштоўнасцю і якія атрымалі па пастанове урадавых органаў статус запаведнікаў;

– палацы-музеі (Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў і інш.) – захоўваюць і рэпрэзентуюць палацы і іх паркавае асяроддзе і імкнуцца ўзнавіць музейнымі сродкамі «вобраз свету» пэўнай эпохі, які знаходзіць адлюстраванне ў сінтэзе архітэктуры, выяўленчых і прыкладных мастацтваў, садова-паркавага мастацтва палацавага ансамбля;

– музеі-сядзібы (напрыклад, Музей-сядзіба Т. Касцюшкі, Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва», Музей-сядзіба Ф. Багушэвіча «Кушляны») – захоўваюць або ўзнаўляюць абстаноўку жылога дома, ствараюць гісторыка-біяграфічныя экспазіцыі, імкнуцца прадставіць сядзібу ў яе цэласнасці;

– дамы-музеі (Дом-музей І з'езда РСДРП, Дом-музей М. Шагала, Дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку і інш.) – створаны на аснове музеефікацыі дамоў, у якіх жылі выдатныя дзеячы гісторыі і культуры ці адбываліся значныя гістарычныя падзеі. У назве гэтай групы, як правіла, прысутнічае імя мемарыруемай асобы або пазначаецца падзея.

Такім чынам, музеефікацыя з'яўляецца такім жа важным напрамкам музейнай дзейнасці, як і фондавая, экспазіцыйная, культурна-адукацыйная дзейнасць. Архітэктурна-прыродны комплекс – вельмі дзейсны сродак асваення асяроддзя пражывання чалавечай супольнасці, фактар стабілізацыі яе якасцяў, інструмент вырашэння многіх важных сацыяльных праблем. У цяперашні час развіццё такіх музеяў можа паспрыяць вырашэнню праблем сацыяльнай адаптацыі, кансалідацыі грамадства, зняцця напружанняў. Вывучэнне працэсу музеефікацыі архітэктурна-прыродных комплексаў нашай краіны з'яўляецца адным з неабходных крокаў у дадзеным накірунку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Каулен, М. Е.* Музеефикация как одно из основных направлений музейной деятельности / М. Е. Каулен // Экологические проблемы развития музеев-заповедников. – М., 2008. – С. 35–50.

2. Музеефикация // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – 2002. – Режим доступа: http://www.museum.ru/rme/rme.htm. – Дата доступа: 20.02.2014.

3. *Равикович, Д. А.* Социальные функции и типология музеев / Д. А. Равикович // Музееведение. Вопросы теории и методики. – М., 1987. – С. 19–24.

4. *Сапанжа, О. С.* Теория музея и музейности : историографический обзор и историческая типология / О. С. Сапанжа. – СПб., 2011. – 98 с.
5. Словарь актуальных музейных терминов / М. Е. Каулен [и др.] // Музей. – 2005. – № 5. – С. 47–68.

*С. Г. Григорчик, магистрант БГУКИ*
*Научный руководитель – Л. К. Кухто,*
*кандидат культурологии, доцент*

## АГРОЭКОТУРИЗМ КАК СПОСОБ СОХРАНЕНИЯ И ПОПУЛЯРИЗАЦИИ БЕЛОРУССКОЙ НАРОДНОЙ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Народная культура включает в себя культурные пласты разных эпох от глубокой древности до настоящего времени. Формирование и функционирование феномена народной культуры в этническом сообществе или социальных группах и общностях разного типа связано с осознанием их принадлежности к народу [3]. Важное качество народной культуры во все периоды – традиционность. Традиционная народная культура определяет и нормирует все аспекты жизнедеятельности общества: уклад жизни, формы хозяйственной деятельности, обычаи, обряды, тип семьи, воспитание детей, характер жилища, тип одежды и питания, отношения с природой, предания, верования, поверья, язык, фольклор и т. д.

Отличительной чертой в формировании белорусского этноса и культуры в целом является тесная взаимосвязь с народной культурой. Белорусский фольклор – один из самых богатых в мире (песни, магические заклинания, былины, сказки, легенды, предания и т. д.). Образцы традиционной культуры сохранились в Беларуси и до наших дней в сельской среде [2, с. 112]. Белорусский аутентичный фольклор в контексте европейских этнокультурных процессов имеет особое историко-культурное значение, так как до настоящего времени сохраняет системную целостность. Одной из форм популяризации и сохранения белорусской народной культуры является агроэкотуризм.

В настоящее время в Беларуси формируется свой национальный туристический продукт – отдых в деревне. Сельский туризм (или агроэкотуризм) – относительно новый вид туризма,